цях і якасцях, якімі неабходна валодаць кампазітару і імправізатару. Сярод іх можна акрэсліць такія, як самастойнасць суб'екта дзейнасці, арыгінальнасць, уражлівасць, персанальная адказнасць за створаны прадукт, выбіральнасць, мужнасць мець уласную думку, гатоўнасць ісці на рызыку. Гэта таксама прадуктыўнае мысленне, асноўная функцыя якога зводзіцца да стварэння новага музычнага зместу, што выказваецца пры дапамозе новай гукавой канструкцыі. Дывергентнае мысленне накіравана на пошук лагічных магчымасцей і заўсёды стаіць перад альтэрнатывай выбару ці шляху мастацка-вобразнага развіцця, ці музычна-выразных сродкаў увасаблення. Гэта і прадуктыўнае ўяўленне, якое ў адрозненне ад рэпрадуктыўнага, накіравана на стварэнне вобразаў на аснове самых розных камбінацый элементаў былога вопыту. Не менш важнай здольнасцю, неабходнай як кампазітару, так і імправізатару, з'яўляецца інтуіцыя. Далучэнне да дзейнаснага працэсу неўсвядомленай сферы — абавязковая ўмова ўсялякага творчага акта. Інтуіцыя, як правіла, цесна ўзаемадзейнічае з лагічным мысленнем. І там, дзе для вырашэння праблемы суб'екту творчасці аказваецца недастаткова ведаў, вопыту, на дапамогу прыходзіць інтуіцыя.

Развіццё музычна-прадуктыўных здольнасцей навучэнцаў у сучасных умовах -- адна з найбольш важных задач, якія стаяць перад сістэмай музычнай адукацыі. Школа, як і раней, арыентуецца на авалоданне рэпрадуктыўнай дзейнасцю, на засваенне гатовых ведаў. Творчае развіццё асобы галоўным чынам ажыццяўляецца ў рамках выканання. Гэта прыводзіць да аднабаковага, гіпертрафіраванага развіцця рэпрадуктыўных здольнасцей на шкоду прадуктыўным. Прынцып адзінства рэпрадуктыўнай і прадуктыўнай музычнай дзейнасці павінен стаць асноўным прынцыпам музычнага выхавання. Для гэтага неабходна ўключэнне ў вучэбны працэс блока дысцыплін, вузка накіраваных на авалоданне навыкамі імправізацыі, сачынення і апрацоўкі музыкі. Выкладаць названыя дысцыпліны, вядома ж, трэба выкладчыкам, якія маюць вопыт практычнай дзейнасці ў адпаведнай галіне і валодаюць методыкай навучання. Істотным фактарам, які перашкаджае эфектыўна займацца музычна-прадуктыўнай дзейнасцю і паспяхова развіваць музычна-творчыя здольнасці навучэнцаў, з'яўляецца недастатковая навукова-метадычная забяспечанасць вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Пераадоленне акрэсленых супярэчнасцей дазволіла б павысіць эфектыўнасць музычнай падрыхтоўкі спецыялістаў, прывесці яе ў адпаведнасць з навукова абгрунтаванымі патрабаваннямі, непазбежна спрыяла б усебаковаму і гарманічнаму развіццю асобы навучэнца, фарміраванню яго музычна-творчых здольнасцей.

**Зыгмантовіч С.В.,**
*дацэнт*
**Клімянкова Н.У.,**
*дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ – АКТУАЛЬНАЯ ЗАДАЧА ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ-БІБЛІЁГРАФАЎ

Фарміраванне камунікатыўнай культуры бібліятэкара-бібліёграфа, яго гатоўнасці да эфектыўных прафесійных зносін — найважнейшы аспект падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Ён не толькі павінен валодаць інфармацыяй, быць прафесіяналам у галіне сучасных бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій, але і на высокім узроўні ажыццяўляць функцыі пасрэдніка паміж творамі друку, іншымі носьбітамі інфармацыі і карыстальнікам, чытачом. А гэта немагчыма без высокай камунікатыўнай кампетэнтнасці, якая ў рэшце рэшт вызначае здольнасць альбо няздольнасць чалавека да зносін. Уменні і навыкі, што ўваходзяць у склад камунікатыўнай кампетэнтнасці, можна ўмоўна падзяліць на тры групы: перцэптыўныя, камунікатыўныя і інтэрактыўныя. Такая градацыя адпавядае псіхалагічнай структуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зносін і дазваляе перайсці ад навучання зносінам наогул да мэтанакіраванай карэкцыі асобных бакоў камунікатыўных паводзін студэнтаў.

Так, у працэсе выкладання спецкурса «Бібліятэчныя зносіны» на спецыялізацыі «публічныя бібліятэкі» не толькі даецца сістэма ведаў аб зносінах і іх адметных рысах ва ўмовах публічнай бібліятэкі, прыёмах і спосабах узаемадзеяння з чытачом, але і адбываецца адпрацоўка асобных навыкаў і ўменняў успрымання і разумення партнёра па зносінах, прыёму і перадачы інфарацыі, узаемадзеяння ў працэсе пошуку патрэбнай літаратуры. Напрыклад, у час чытання лекцыі па тэме «Бібліятэкар і чытач як партнёры ў зносінах. Іх узаемнае ўспрыманне» разглядаюцца заканамернасці ўспрымання, вытокі і спосабы інтэрпрэтацыі выгляду суразмоўцы, сувязь фарміравання ўяўленняў аб іншым чалавеку з узроўнем уласнай самасвядомасці, тыповыя памылкі ўспрымання, фактары, якія спрыяюць фарміраванню атракцыі і спосабы яе дасягнення. На практычных занятках адбываецца набыццё навыкаў успрымання, з аднаго боку, і ўменняў самапрэзентацыі — з другога. Студэнты вучацца не толькі разумець, што за чалавек перад імі, але і так сябе трымаць, каб у чытача склалася найбольш спрыяльнае ўражанне аб бібліятэкары і бібліятэцы. Падкрэсліваецца, што перцэптыўны бок зносін актыўна ўплывае на камунікатыўныя працэсы, а таксама стварае ўмовы для ўзаемадзеяння.

Праблемам камунікатыўнага ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом адводзіцца значнае месца ў спецкурсе. І гэта невыпадкова. Уменне слухаць, разумець і красамоўна выказваць свае думкі — адзін з істотных бакоў камунікатыўнай культуры. Тут мала ведаць асноўныя этапы размовы, прыёмы і спосабы камунікатыўных паводзін на розных этапах зносін, псіхалагічныя бар'еры і спосабы іх пераадолення ва ўзаемазносінах з чытачом. Трэба ўвесь час практыкавацца ў мастацтве вядзення размовы, у майстэрстве выступлення. Як нельга навучыцца плаванню, не ўваходзячы ў ваду, так немагчыма моўчкі авалодаць культурай размовы. Такая думка ўвесь час падкрэсліваецца на лабараторных занятках. Акрамя таго, студэнтам прапануецца выкарыстоўваць як мага больш магчымасцей праяўлення камунікатыўнай актыўнасці і падчас заняткаў, і ў міжасабовых зносінах.

Інтэрактыўныя навыкі і ўменні бібліятэкарам патрабуюцца часцей за ўсе ў сітуацыях, звязаных з выкананнем складаных запытаў, арганізацыяй сумеснай дзейнасці ў ходзе падрыхтоўкі масавых мерапрыемстваў, падчас ліквідацыі канфліктаў. Акрамя вывучэння тэарэтычнага матэрыялу, тут добрыя вынікі даюць ролевыя і дзелавыя гульні, разбор канкрэтных выпадкаў прафесійных зносін бібліятэкара. Усё гэта спрыяе фарміраванню здольнасці да ўзамадзеяння, неабходнай ва ўмовах бібліятэчных зносін. На розных мадэлях кантактнага ўзаемадзеяння студэнты навучаюцца выбіраць аптымальныя спосабы паводзін у адпаведных вытворчых сітуацыях.

Падчас правядзення падагульняючых заняткаў — дзелавой гульні «Арганізацыя чытацкіх зносін» — студэнты павінны прадэманстраваць разнабаковасць камунікатыўнай кампетэнтнасці, паказаць свае здольнасці і веды.

Нельга лічыць, што з увядзеннем спецкурса «Бібліятэчныя зносіны» вырашаны праблемы камунікатыўнай падрыхтоўкі бібліятэкараў, хаця, па нашых назіраннях, студэнты, якія вывучалі дадзены спецкурс, выгадна адрозніваюцца ад іншых. Яны больш раскаваныя, знаходлівыя і кемлівыя на практычных занятках па курсу «Бібліятэчнае абслугоўванне». Справа ў тым, што дадзеная вучэбная дысцыпліна патрабуе ад навучэнцаў пэўных камунікатыўных навыкаў і ўменняў. Тут адпрацоўваюцца розныя аспекты прафесійных паводзін бібліятэкара ва ўмовах індывідуальнага і масавага абслугоўвання чытачоў. Найбольш тыповыя сітуацыі абслугоўвання ў бібліятэцы ўзнікаюць і развіваюцца па законах зносін, і веданне гэтых законаў — неабходная ўмова прафесійнай падрыхтоўкі будучага бібліятэкара. Таму для студэнтаў спецыялізацый, на якіх не выкладаецца спецкурс «Бібліятэчныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зносіны», у праграму ўведзена лекцыя «Бібліятэчныя зносіны», але гэтага недастаткова. На наш погляд, трэба чытаць адпаведны курс студэнтам усіх спецыялізацый.

Высокая камунікатыўная культура патрэбна бібліятэкару не толькі ў абслугоўванні чытачоў, але і ў міжасабовых кантактах паміж членамі калектыву, у метадычнай рабоце і кіраванні бібліятэкай. На жаль, у межах курса «Арганізацыя, эканоміка і кіраванне бібліятэчнай справай» няма магчымасці грунтоўна разглядаць адпаведныя пытанні. Мэтазгодна, на нашу думку, увядзенне курса «Псіхалогія кіравання», у якім праблемы зносін паміж кіраўнікамі і падначаленымі, стварэнне спрыяльнага мікраклімату ў калектыве будуць разгледжаны грунтоўна і дасканала.

Развіццё камунікатыўных здольнасцей студэнтаў адбываецца і ў працэсе выкладання бібліяграфічных дысцыплін. Нягледзячы на тое, што ў сучасным бібліяграфазнаўстве тэрмін «бібліяграфічныя зносіны» не з'яўляецца дастаткова распаўсюджаным, камунікатыўная сутнасць бібліяграфічнай дзейнасці вымушае звярнуць пільную ўвагу на спецыфіку зносін бібліёграфа з чытачом і разглядаць падрыхтоўку спецыяліста не толькі з пункту гледжання засваення тэхналогіі стварэння бібліяграфічнай прадукцыі, а і з пункту гледжання фарміравання камунікатыўных якасцей асобы.

У бібліяграфічнай дзейнасці можна вызначыць два віды зносін: непасрэдныя і апасродкаваныя. Непасрэдныя зносіны ажыццяўляюцца ў працэсе міжасабовых кантактаў з чытачамі-спажыўцамі інфармацыі пры выкананні запытаў, высвятленні інфармацыйных патрэб, індывідуальным інфармаванні, выступленнях перад аўдыторыяй. Апасродкаваныя зносіны ўяўляюць сабой спецыфічнае ўзаемадзеянне з чытачом праз вынікі бібліяграфічнай дзейнасці: дапаможнікі, паказальнікі, спісы літаратуры, картатэкі і іншую бібліяграфічную прадукцыю. У гэтым выпадку бібліёграф не ўступае ў непасрэдны кантакт з чытачом, але ўзаемадзеянне са спажыўцамі інфармацыі тым не менш ажыццяўляецца па законах зносін, з улікам іх асаблівасцей. Больш таго, калі бібліёграф, ствараючы дапаможнік, добра ўяўляе сабе спажыўца, арыентуецца на задавальненне яго патрэб, улічвае псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання тэксту, вынікі яго творчасці карыстаюцца попытам, таму што чытач у дадзеным выпадку выступае не як абстрактная адзінка, а ў якасці паўнапраўнага партнёра ў зносінах.

У бібліёграфазнаўстве вызначаюцца наступныя напрамкі фарміравання камунікатыўных здольнасцей бібліёграфаў:

— веданне псіхалогіі асноўных груп спажыўцоў інфармацыі, уменне мадэліраваць іх патрэбы;

— валоданне майстэрствам вуснага выступлення, уменне знайсці пераканаўчыя аргументы, правільны тон, улічваючы асаблівасці аўдыторыі;

— здольнасць хуткага пераключэння ўвагі з аднаго прадмета на другі;

— уменне наладжваць кантакты з чытачамі, па-дзелавому весці дыялог, разумець сутнасць запыту, схільнасць да давернай размовы з чытачом, устаноўка на зносіны;

— уменне спалучаць у сваёй камунікатыўнай дзейнасці пазнавальныя элементы з эмацыянальнымі.

У выкладанні курса «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці» развіццё камунікатыўных якасцей студэнтаў ажыццяўляецца на двух узроўнях:

— фарміраванне агульнапрафесійных навыкаў, неабходных для выканання бібліяграфічных працэсаў, ведання бібліяграфічных крыніц, тэхналогіі, формаў і метадаў бібліяграфічнай дзейнасці;

— павышэнне камунікатыўнай культуры, неабходнай і дастатковай для ажыццяўлення бібліяграфічных працэсаў.

Паміж вызначанымі ўзроўнямі прафесійнай падрыхтоўкі бібліёграфа існуе дыялектычная сувязь. Высокі прафесіяналізм дазваляе бібліёграфу ўпэўнена адчуваць сябе ў разнастайных сітуацыях узаемадзеяння са спажыўцом інфармацыі, а камунікатыўная культура спрыяе больш якаснаму і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эфектыўнаму выкананню прафесійных функцый.

Напрыклад, на лабараторных занятках па тэмах, прысвечаных даведачна-бібліяграфічнай рабоце, поруч з вызначэннем тыпу запыту, яго асноўных пошукавых адзнак, крыніц выканання, уліку запытаў і даведак, значная ўвага адводзіцца гутарцы з чытачом, якая павінна адбывацца з улікам заканамернасцей зносін. Мадэліруюцца сітуацыі бібліяграфічных зносін, калі ў ролі чытача выступае выкладчык альбо студэнт. Студэнт, які выконвае ролю бібліёграфа, павінен высветліць запыт, удакладніць тэму, мэтавую накіраванасць, атрымаць іншую інфармацыю, неабходную для выканання даведкі. Звяртаецца ўвага на неабходнасць наладжвання псіхалагічнага кантакту са спажыўцом інфармацыі, узаемаразумення і ўзаемадзеяння з ім. Вельмі важна, каб студэнт навучыўся правільна ставіць пытанні і дакладна разумець сутнасць запыту.

Аналагічным чынам на факультэце завочнага навучання праводзяцца заняткі, прысвечаныя арганізацыі індывідуальнага інфармавання ў бібліятэцы, калі студэнт-бібліёграф пры пастаноўцы на індывідуальнае абслугоўванне ажыццяўляе гутарку-інтэрв'ю з чытачом. Падрыхтоўка студэнта да зносін у ходзе такіх заняткаў грунтуецца на аналізе рэальных сітуацый бібліяграфічнага абслугоўвання, тыповымі ў бібліяграфічнай практыцы. У будучага спецыяліста, такім чынам, фарміруюцца правільныя стэрэатыпы прафесійных паводзін.

У якасці важнага накірунку развіцця камунікатыўных здольнасцей студэнтаў трэба разглядаць таксама фарміраванне ўменняў аналізаваць дыялог бібліёграфа з чытачом, маналагічныя формы зносін: агляды, кансультацыі і інш. Так, на занятках у форме дзелавой гульні самі студэнты падводзяць вынікі, разбіраюць памылкі, ацэньваюць сваіх таварышаў, выступаючы ў ролі спажыўцоў інфармацыі, задаюць пытанні. Непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні дня бібліёграфа, дня спецыяліста дазваляе студэнтам у поўнай меры праявіць свае прафесійныя веды і камунікатыўныя якасці, параўнаць свае магчымасці з магчымасцямі калег, што спрыяе павышэнню камунікатыўнай кампетэнтнасці.

Бібліяграфічныя працэсы, якія характарызуюцца апасродкаванымі зносінамі, таксама патрабуюць пільнай увагі. Як адзначалася вышэй, пры стварэнні бібліяграфічных дапаможнікаў рознага тыпу і зместу неабходна ўлічваць заканамернасці зносін.

Пачынаючы работу над бібліяграфічным дапаможнікам, кожны бібліёграф арыентуецца на пэўную групу чытачоў, улічвае іх патрэбы, сацыяльна-псіхалагічныя характарыстыкі, што ўплывае на выбар метадычных рашэнняў. У дапаможніку заўсёды прысутнічаюць элементы, якія выконваюць камунікатыўную ролю: прадмова, зварот, парады чытачу, анатацыя, назвы раздзелаў, уступныя тэксты да раздзелаў, эпіграф. Такія сродкі дапамагаюць спажыўцу пераадолець псіхалагічны бар'ер, палягчаюць успрыманне бібліяграфічнага тэксту. Пры стварэнні дапаможніка бібліёграф вядзе «ўнутраную» размову з чытачом, у ходзе якой праяўляюцца асабістыя якасці складальніка, яго цікавасць да тэмы, склад мыслення, стыль, адносіны да дакумента, прафесійнае майстэрства. Нягледзячы на тое, што працэс бібліяграфавання не носіць характару непасрэдных зносін, засваенне студэнтамі яго заканамернасцей непасрэдна звязана з праяўленнем такіх камунікатыўных навыкаў і ўменняў, як успрыманне і разуменне партнёра, фарміраванне вобраза суразмоўцы, майстэрства інфармавання спажыўца і ўзаемадзеяння з ім.

На жаль, прыёмы і заканамернасці бібліяграфічных зносін пакуль не знайшлі адлюстравання ў спецыяльных нарматыўных, тэхналагічных дакументах і службовых інструкцыях. Таму ўзрастае роля выкладчыкаў у фарміраванні камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў.

Вырашэнне задачы фарміравання камунікатыўнай культуры студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм звязана з неабходнасцю стварэння комплекснай сістэмы падрыхтоўкі іх да зносін з чытачамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ролю падмурка, тэарэтычнай базы, асновы набыцця камунікатыўнай кампетэнтнасці павінны, на наш погляд, выконваць курсы псіхолага-педагагічнага цыкла. Але іх трэба выкладаць з улікам патрабаванняў будучай спецыяльнасці, звяртаючы ўвагу студэнтаў на магчымасці выкарыстання атрыманых ведаў у іх прафесійных зносінах. Не менш важнымі з'яўляюцца і агульнаадукацыйныя дысцыпліны: гісторыя, філасофія, літаратура і інш. Яны ствараюць інфармацыйную базу, запас ведаў, дастатковых дзеля таго, каб свабодна арыентавацца ў разнастайных пытаннях мінулага і сучаснасці, літаратуры і мастацтва, якія штодзённа і непазбежна ўзнікаюць у працэсе бібліятэчнага абслугоўвання. Нарэшце, шэраг спецкурсаў, такіх як «Бібліяграфічныя зносіны», «Камунікатыўныя аспекты бібліяграфічнай дзейнасці», «Псіхалогія кіравання», «Культура мовы», павінны мэтанакіравана і грунтоўна фарміраваць камунікатыўныя навыкі і ўменні, рыхтаваць будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў да прадуктыўных зносін з карыстальнікамі бібліятэк і калегамі па рабоце. Далей камунікатыўная культура, здольнасці да актыўных зносін праяўляюцца, шліфуюцца і ўдасканальваюцца ў ходзе вывучэння студэнтамі спецыяльных дысцыплін, дзе адпрацоўваюцца алгарытмы паводзін у канкрэтных, найбольш тыповых і распаўсюджаных вытворчых сітуацыях.

Такім чынам, амаль усе вучэбныя дысцыпліны ў той ці іншай ступені спрыяюць фарміраванню камунікатыўных якасцей студэнтаў. Трэба толькі звяртаць увагу і на засваенне імі ведаў, і на здольнасць гэтыя веды праяўляць, паказваць, перадаваць з дапамогай камунікатыўных сродкаў. Аднак галоўным звяном у сістэме камунікатыўнага выхавання студэнтаў павінны стаць спецкурсы і спецсемінары па праблемах прафесійных зносін як найбольш мэтакіраваныя і выніковыя.

Савельева Т.М.,
*прафесар*

## АБ НЕАБХОДНАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАГА МЫСЛЕННЯ Ў СТУДЭНТАЎ ВНУ

Будучае нашай рэспублікі залежыць ад зместу бесперапыннай адукацыі. Вось чаму адукацыю трэба разглядаць як сродак, умову і фактар сацыяльнай рэпрадукцыі чалавека. Адукацыя павінна забяспечыць станаўленне «механізма» развіцця асобы чалавека, што з'яўляецца адным з вырашаючых фактараў развіцця грамадства.

Павысіць якасць адукацыі, забяспечыць больш высокі ўзровень выкладання прадметаў у сістэме бесперапыннай адукацыі магчыма толькі на аснове выкарыстання тых ведаў, якія назапасіла за апошнія дзесяцігоддзі псіхалагічная навука.

З улікам адзначанага важнейшай задачай сучаснай вышэйшай адукацыі павінна быць фарміраванне ў студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі прафесійнага мыслення і асобасных якасцей чалавека.

Заўважым, што мысленне як грамадска-гістарычная з'ява заўсёды ўзнікае на аснове працы і сацыяльнай практыкі чалавека.

Развіццё ж самой практыкі прыводзіць да змен у мысленні спецыяліста, а развіццё працы і ўзнікненне розных відаў прафесійнай дзейнасці, у сваю чаргу, — да прафесіяналізацыі чалавека.

У спецыяльнай і філасофскай літаратуры даецца апісанне розных тыпаў мыслення: першабытнага, антычнага, сярэдневяковага, рабаўладальніка і раба, феадала і прыгоннага селяніна, буржуа і пралетарыя, філасофскага, прыродазнаўчага, мастацкага, маральнага, рэлігійнага, юрыдычнага, палітычнага, навуковага і інш.

Павышэнне эфектыўнасці вышэйшай адукацыі ў сучаснай ВНУ немагчыма без павышэння ўзроўню прафесійнага мыслення.

У культурна-гістарычным плане прафесійны тып мыслення ўзнікае як вынік спецыялізаванага мыслення пэўных сацыяль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ